УДК 9(476)

# НЭП і асаблівасці пасляваеннай сітуацыі ў БССР (1920-1925 гг.)

Арбузаў А.Ц.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Сацыяльна-эканамічная нестабільнасць у Беларусі, палітычнае саперніцтва кампартыі і іншых палітычных сіл у пачатку 20-х гадоў XX ст. тармазілі ажыццяўленне рэформ, садзейнічалі росту недаверу насельніцтва да палітыкі ўраду. Таму антыбальшавіцкі рух на Беларусі праходзіў праз прафсаюзы і кааператывы ў гарадах, праз сялянскія з'езды – у вёсках, якія спачатку выступалі пад лозунгамі дэмакратызацыі грамадства, ліквідацыі палітыкі ваеннага камунізму, а затым і абмежавання дыктату кампартыі. Гэтыя працэсы закранулі і антыўрадавую ўзброенную апазіцыю. Яна перажывала востры арганізацыйны крызіс, выкліканы распадам палітычных цэнтраў і паражэннямі на франтах. Адсутнасць кіруючых цэнтраў прывяла да канцэнтрацыі дзейнасці вакол такіх структур, як "Сялянскі саюз", "Грамада моладзі", "Зялёны дуб", арыентаваных на партызанскую барацьбу. З дазволу польскіх улад генерал С. Булак–Балаховіч у лістападзе 1920 г. сфарміраваў узброенную армію колькасцю 20 тыс. чалавек, фінансаванне і забяспячэнне якой ажыццяўлялася праз створаны Б. Савінкавым у Варшаве "Рускі эвакуацыйны камітэт". Разбіўшы часці Чырвонай Арміі, войскі генерала занялі Петрыкаў, Калінкавічы, Мазыр, дзе С. Булак-Балаховіч абвясціў сябе начальнікам Беларускай дзяржавы, а П. Алексюка – на чале "урада Беларусі". З дапамогай тэрору і пагромаў апазіцыя ўвогуле здолела ўзяць пад свой кантроль значную тэрыторыю ў Мазырскім, Ігуменскім, Слуцкім і Бабруйскім паветах. Чырвоная Армія разграміла ваенныя фарміраванні, але частка войск прабілася ў Польшчу, адкуль асобныя атрады ўдзельнічалі ў нападах на БССР аж да 1922 года.

Улічваючы сітуацыю на Беларусі, кіраўніцтва апазіцыі мяняла планы і тактыку паўстанцаў. Калі зімой 1921 г. адбываліся пагромы і забойствы прыхільнікаў Савецкай улады, разгром харчскладаў і харчатрадаў, то з вясны 1921 г. мэтаю стала звяржэнне Савецкай улады шляхам падпольнай работы, тэрор супраць дзяржаўных служачых, знішчэнне дзяржаўных і грамадскіх устаноў.